УДК 821.161.3(09)

**А. М. Макарэвіч,**
доктар філалагічных навук, дацэнт,
прафесар кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый
МДУ імя А. А. Куляшова
(Магілёў, Беларусь)

# МАСТАЦКІ СВЕТ АПОВЕСЦЕЙ І. ШАМЯКІНА 1990-х гг. СЭНСАЎТВАРАЛЬНЫЯ ДАМІНАНТЫ

Характарызуюцца асаблівасці мастацкага свету аповесцей І. Шамякіна “Без пакаяння” (1994), “Бумеранг” (1994), “Выкармак” (1995), “Крывінка” (1996). На падставе характарыстыкі асаблівасцей мастацкага свету названых вышэй і інш. твораў сцвярджаецца, што аповесці І. Шамякіна акрэсленага перыяду ў сукупнасці іх сацыяльных зрэзаў з’яўляюцца своеасаблівай літаратурнай панарамай супярэчлівых, разбуральных, перспектыўных і бесперспектыўных маральных праяў рэчаіснасці гэтага часу. “*Чалавецтва ў сваім развіцці пайшло не па той дарозе*” – у такой выснове Віталія Галавана (“Крывінка”) утрымліваецца таксама аўтарскае перакананне ў праекцыі на рэчаіснасць 1990-х гадоў, якое ўплывала на сістэму сэнсаўтварэння ў аповесцях І. Шамякіна другой паловы 1990-х гадоў. У выніку творы гэтага перыяду напоўнены сацыяльным разладам, сацыяльным і маральным беспрасвеццем, несправядлівасцю, “блуканнем па пакутах” і інш. А малая доля надзеі і спадзяванняў прысутнічае ў іх на ўзроўні прадчуванняў лепшага магчымага, якое перакрэсліваецца ўсё той жа сацыяльнай і маральнай безвыходнасцю.

У аповесцях І. Шамякіна, створаных у 1990-я гады, пісьменнік дастаткова сістэмна выяўляе ў рэчаіснасці тыя праявы, якія вядуць грамадства да маральнага падзення. Пісьменніка цікавіць не толькі звычайны



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

просты чалавек, яго патрэбы і памкненні, пошукі, сродкі выжывання ў разбуральнай рэчаіснасці (“Сатанінскі тур”, “Без пакаяння”, “Палеская мадонна” і інш.), а і чалавек з культурнай або навуковай, партыйнай эліты (“Сатанінскі тур”, “Адна на падмостках”, “Вернісаж”, “Бумеранг” і інш.). І. Шамякін адлюстроўвае таксама праблемы жыцця і “подзвігі” “герояў” новага часу – бізнесменаў, валадароў мясцовага значэння розных рангаў (“Сатанінскі тур”, “Падзенне”, “Без пакаяння” і інш.). Аповесці І. Шамякіна 1990-х гадоў у сукупнасці іх сацыяльных “*зрэзаў*” з’яўляюцца своеасаблівай літаратурнай панарамай супярэчлівых, разбуральных, перспектыўных і бесперспектыўных маральных праяў рэчаіснасці гэтага часу.

Прасочым вылучаныя вышэй асаблівасці на прыкладзе аповесцей “Без пакаяння” (1994), “Бумеранг” (1994), “Выкармак” (1995), “Крывінка” (1996).

Аповесць “Без пакаяння” прадстаўляе два сацыяльныя “*зрэзы*” з рэчаіснасці першай паловы 1990-х гадоў: абсалютныя беднасць і багацце, імкненне да пакаяння і непрыманне яго.

У пачатку гэтага твора фрагментарна акрэсліваюцца ўмовы выжывання сям’і чатырнаццацігадовага Васілька Кірпача.

Ва ўмовах гэтага выжывання І. Шамякін пазбаўляе жыцця свайго маленькага героя – Васілька, які з’яўляецца дастаткова прыстойным прадстаўніком таго пакалення, якому ствараць будучае. Перспектыва лепшага будучага такім чынам перакрэсліваецца.

У гэтай аповесці важную ролю выконвае выпадковасць. Пнеўматычная куля, якая пападае ў Васількова вуха – гэта і своеасаблівы сюжэтаарганізуючы ход, і сэнсаўтваральны факт. Такая трагічная выпадковасць дазваляе засяродзіцца на асэнсаванні ў кантэксце аповесці аднаго з народных выслоўяў: “Бог забірае да сябе лепшых”. Складваецца такое ўражанне, што пісьменнік знарок падкрэслівае разбуральную здольнасць новай рэчаіснасці: яна выпіхвае са сваёй прасторы лепшых яе прадстаўнікоў.

Абставіны, у якіх жыве Васілёк і пры якіх адбываецца яго забойства, выразна высвятляюць у вобразе Анкуды не толькі выпадковага, а і патэнцыйнага забойцу, не толькі злачынцу, які імкнецца пазбегнуць пакарання, а і чалавека, які пакутуе ад зробленага ім. Шамякін-пісьменнік не спачувае гэтаму герою твора. У той жа час аўтар аповесці ўзводзіць яго не толькі на шлях уцёкаў ад пакарання, але і на шлях пакутаў (хай сабе і нязначных у параўнанні з пакутамі маці забітага ім хлопчыка),



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

на шлях хоць і частковага, але пакаяння. Пісьменнік прыводзіць свайго героя ў сітуацыю загнанага ваўка. Толькі загон, у якім ён гіне, ствapae сабе сам Анкуда. Ён зыходзіць з жыццёвай прасторы, уцякаючы ад сваіх праследавацеляў (хаўруснікаў яго ранейшага абаронцы ад закона – пракурора-хабарніка Якімкіна) такім чынам, каб стварыць небяспечную дарожную сітуацыю, у якой бы яны загінулі. Страх пакарання з боку закона і з боку "сваіх" не дазваляе Анкуду канчаткова ажывіць у яго свядомасці сумленне, якое, магчыма, магло б стаць выратавальным для яго душы. Анкуда становіцца ахвярай уласнага жадання ўчыніць нібыта выпадковае (у адрозненне ад стрэлу каля яго крамы), а на самай справе спланаванае ім забойства-аварыю яго праследавацелям.

Анкуда-забойца адыходзіць у нябыт без пакаяння. Зло нібыта пакарана ў асобе Анкуды. Але ці знікла яно? Паводле І. Шамякіна, яго працягвае існаваць у прасторы, яно запаўняе яе сабой нават ва ўмовах, якія, здавалася б, не спрыяюць гэтаму. Пакаранне злом нараджае новае зло. Яно вяртаецца як бумеранг.

"*Сучасны метад помсты*" і яго разбуральныя для невінаватых людзей вынікі І. Шамякін адлюстраваў у аповесці "Бумеранг" праз спалучэнне рэальнага мастацкага свету твора з рэтраспекцыйным, які прадстаўлены ў аповесці дастаткова шырока. Падзеі рэальнага мастацкага свету адбываюцца ў канцы 1993 года, падзеі з успамінаў галоўнага героя адносяцца да ваеннага перыяду: часу зняволення яго ў савецкім лагеры.

У рэальным мастацкім свеце галоўны герой аповесці стварае рэтраспекцыйны мастацкі свет. Сам Іван Мацвеевіч называе гэтыя ўспаміны "*споведдзю*", "*блуканнямі па пакутах*". Ён то "*канспектыўна «прачытвае»*", то "*гартае свой рукапіс*". Гэты "*ўспамін*" Івана Мацвеевіча з'яўляецца своеасаблівай яго пакутай.

З усіх успамінаў і каментарыяў да іх галоўнага героя вынікае, што ён напісаў гэтую "*споведзь*" яшчэ раней, да моманту паўторнага фрагментарнага ўзнаўлення яе ў сувязі з хваробай дачкі. Сукупнасць рэтраспекцыйных фактаў гэтай аповесці дастаткова разгорнутая ў тым варыянце, які фрагментарна ўзнаўляе Іван Мацвеевіч. І толькі падзеі аб стварэнні падарунка Сталіну на сакрэтнай базе ён упершыню рэпрэзентуе ў такой форме, якая можа быць абнародавана. Да гэтага Жыгуновіч не рашаўся гаварыць на тэму помсты вязняў-даследчыкаў Сталіну з дапамогай уманціраванага ў падарунак вусатаму кіраўніку радыеактыўнага рэчыва.

Што ж нараджае такую нерашучасць галоўнага героя?

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Найперш гэта боязь, страх агучыць у "*споведзі*" (у першую чаргу для родных) сваё дачыненне да зробленага падарунка Сталіну: яны могуць не зразумець, запатрабаваць пакаяння, а ён, "*грэшнік*" не зможа гэтага зрабіць. Разам з гэтым Іван Мацвеевіч асэнсоўвае сваю невінаватасць за наступствы свайго ўчынку, і ў той жа час ён адчувае, што пакараны за "*тую сваю помслівасць*". У такой сітуацыі Жыгуновіч (ускосна, з дапамогай рытарычных пытанняў) спрабуе растлумачыць, чаму не пісаў раней пра падарунак Сталіну: перашкаджала адчуванне, што "*пераступілі мяжу чалавечнасці, мяжу маралі*". Нерашучасць Івана Мацвеевіча ў адносінах да ўзнаўлення ўжо цяпер, калі дачка хворая, у сваёй "*споведзі*" падзей, якія адносяцца да часу стварэння падарунка-бумеранга, звязана яшчэ і з тым, што ён адчувае ўласную віну ў сувязі з Аленінай хваробай, якая, паводле гэтага адчування, ёсць пакараннем за парушэнне ім хрысціянскага закона "*Не забі!*".

Аповесць "Бумеранг" напоўнена пэўнай доляй надзеі ў тое, што лепшае ў жыцці ўсё ж перамагае. Галоўны герой твора ў думках выказвае меркаванне, што ён "*не можа каяцца*". У той жа час значную сэнсаўтваральную ролю ў аповесці выконваюць імкненні (апасродкаваныя) Івана Мацвеевіча да пакаяння, якое ён, прамаўляючы яго найперш для сябе, усё ж выносіць у быційную прастору. І такія намаганні Жыгуновіча маюць станоўчы вынік: яны спрацоўваюць, спрыяюць узнікненню лепшых абставін у плыні падзей рэальнага мастацкага свету аповесці.

У гэтых адносінах твор адрозніваецца ад іншых, напісаных І. Шамякіным у 1990-я гады, "Paradies auf erden", "Вернісаж", "Сатанінскі тур", "Падзенне", "Адна на падмостках", "Без пакаяння" і інш., напоўненых абсалютнай змрочнасцю: такімі з'явамі, як смерць, хваробы, здрада, помста, маральнае падзенне, безвыходнасць. Ствараецца такое ўражанне, што пісьменнік мэтанакіравана і абсалютна скандэнсавана пераносіў у свае аповесці вызначанага часу тыя факты з рэчаіснасці, якія ў полі аўтарскай творчасці гэтага перыяду стваралі б эфект сацыяльнага і маральнага беспрасвецця і безвыходнасці.

Падзеі рэальнага мастацкага свету аповесці "Выкармак" адбываюцца ў Мінску, пачынаючы з канца 1980-х, на працягу некалькіх (каля трох) гадоў. Імкнучыся ўзысці на высокую палітычную прыступку, галоўны герой аповесці актыўна ўдзельнічае ў рознага тыпу грамадскіх падзеях. Некаторыя з іх увайшлі ў гісторыю Беларусі як знакавыя праявы грамадскага жыцця постсавецкага перыяду.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У цэнтры аповесці – Уладлен Супец – старэйшы сын Ульяна Мацвеевіча Супца, уплывовага ў партыйных колах чалавека, які з'яўляецца "*кіраўніком справамі высокага камітэта*" (ЦК КПБ), "*трыццаць пяць гадоў служыў партыі*".

Кароткія рэтрапекцыі аповесці акрэсліваюць шлях галоўнага героя да вялікай палітыкі.

Рэальны мастацкі свет твора – гэта ўзыходжанне галоўнага героя на палітычны і пісьменніцкі алімпы. Узыходжанне на першы з гэтых алімпаў стала паспяховым: Уладлен быў абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, а затым (пасля прэзідэнцкіх выбараў) атрымаў пасаду ў Кабінеце Міністраў. Спроба ўзыходжання на другі алімп стала для яго (па вялікім рахунку) няўдалай: у Саюз пісьменнікаў ён так і не прайшоў.

Праявы характару Уладлена і адпаведныя дзеянні, на якія звяртае ўвагу пісьменнік у адпаведным асобасным і грамадскім, грамадзянскім кантэкстах твора, – рашучае адмаўленне ад ранейшых ідэйных арыенціраў і адпаведнай ім дзейнасці; рашучае выкрыццё "*балотнай застойнасці*", "*страты пачуцця нацыянальнага патрыятызму*" на пленуме гаркама камсамола; пратэст на перадвыбарчым сходзе супраць "*прывілеяў партнаменклатуры*"; прыстасавальніцкае і двурушнае супрацоўніцтва з апазіцыйным рухам "Пагоня". У выніку гэтых і іншых дзеянняў Уладлен імкліва "*прыскакаў у авальную залу Дома ўрада*", атрымаў пасаду намесніка старшыні камісіі ("*па новых мерках – намесніка міністра*").

У той жа час аўтар надзяляе гэтага героя такімі маральнымі якасцямі, як сумленне і непадкупнасць. Аднак пры гэтым варта звярнуць увагу на маральныя ўстаноўкі і сацыяльныя ўмовы, на якія арыентаваўся Уладлен Супец пры выпрацоўцы і імкненні захаваць гэтыя якасці.

Ён, такі "*сумленны і непадкупны*", выпешчаны на ўлонні дабрабыту, дасягнутага службовым становішчам бацькоў, збіраў факты для выкрыцця ў парламенце хабарніцтва, "*каб нанесці ўдар па хабарніках*". Пры дапамозе такіх і падобных сюжэтных сітуацый аўтар паступова падводзіць чытача да разумення сутнасці галоўнага героя як сацыяльнага тыпа: выкармак.

Паказальнай якасцю характару Уладлена Супца ў перыяд яго дзейнасці ў Вярхоўным Савеце была помста. Час ад часу ў свядомасці галоўнага героя асэнсоўваюцца адпаведныя пэўным сітуацыям сродкі помсты тым, якія так ці інакш не прызнае значнасць і самадастатковасць яго асобы.

Жаданне помсціць у свядомасці Уладлена перакрыжоўваецца з яшчэ адной установкай ва ўжо "прафесійнай" яго дзейнасці як дэпутата, які



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"*рашуча пайшоў у бой за шчасце народа*", "*сцёбнуць*" каго-небудзь на сесіі ВС дзеля дасягнення папулярнасці, бо народ такое любіць.

З дапамогай найперш бацькоў, выкарыстоўваючы службовае становішча ў камсамоле, эксплуатуючы ў сваіх мэтах партыйную дзейнасць, затым – дэпутацтва і супрацоўніцтва з апазіцыйным згуртаваннем "Пагоня", Уладлен Супец здзяйсняе тыя свае планы, якія дазволілі яму ўзняцца ў "*завоблачныя вышыні*". Аднак пры такіх абставінах яго сацыяльнага ўзвышэння ён у той ці іншай ступені здраджвае тым, хто дапамог яму здзейсніць гэтае ўзвышэнне. Адкрытая маральная ацэнка такой пазіцыі галоўнага героя была дадзена ўпершыню на пленуме райкама партыі, – "*выкармак*". У другі раз такая характарыстыка ("*выкармак*") для Уладлена прагучала з вуснаў яго маці.

Тэма выкармак і асяроддзе, якое спрыяе яго ўзгадаванню, і адпаведная ёй праблематыка паўтараецца І. Шамякіным у аповесці "Крывінка" (1996). Але калі ў папярэднім творы гэтая тэма развіваецца ў кантэксце найперш уплываў "*выкормлівання*" на грамадскія зносіны, то ў названым яна паглыбляецца на прыкладзе прыватнага жыцця: непасрэднай ахвярай тут становяцца тыя, хто ўзгадаваў сваю "*крывінку*" жорсткай, безаглядна прагматычнай і эгаістычнай асобай.

Падзеі гэтай аповесці адбываюцца на дачы "*прэзідэнта дзвюх фірм – «Амон» і «Бамонд» – Георгія Галавана*", у яго офісе, у міліцыі, на кілеравым хутары. Разгортванне сюжэта твора звязана ў асноўным з двума галоўнымі фактамі: "*асвяшчэннем*" катэджа-дачы Георгія Галавана, а таксама знікненнем (двойчы) яго дачкі Арыядны. Як вынік гэтага – пошукі дачкі і помста бацькі (паводле яго і жончынага пераканання) віноўніку яе знікнення і, магчыма, смерці – Навагодаву, даўняму сябру Галавана.

Справядлівым бачыцца вывад пісьменніка, які ён укладвае ў свядомасць Галавана яшчэ да рашэння аб пакаранні смерцю Навагодава, які, паводле яго меркавання, з'яўляецца віноўнікам знікнення іх дачкі: грамадства, у якім адбываюцца такія і падобныя з'явы, "асуджана". Гэтае "асуджана" апасродкавана скіроўваецца ў рэцэпцыйную свядомасную сферу, праецыруецца на пытанне "асуджана на што?". Аднак прамых адказаў на яго ў творы няма. Асуджанасць гэтага грамадства сцвярджае і сам Галаван ва ўмовах, калі "*жыццё страціла сэнс*" для яго пасля знікнення дачкі, калі сам ён заказвае забойства Навагодава.

"Чалавечы" твар гэтаму свайму герою пісьменнік імкнецца стварыць і пры дапамозе адлюстравання веры Георгія Яўменавіча ў Бога, веры як выніку страху перад перспектывай пакарання Галавана Стваральнікам.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Што ж прыводзіць героя аповесці, які нібыта стаў на шлях веры ў Бога, да забойства? Найперш любоў да дачкі, якую "*любіў больш за ўсё на свеце"* Любоў гэтая "*таіла ў сабе нечаканыя сюрпрызы*". І вось адным з такіх сюрпрызаў, самым страшным, стала жаданне помсціць, бо "*жыццё і паліць, і рэжа*", бо існаванне стала невыносным без дачкі.

У аповесці "Без пакаяння" пісьменнік выводзіць галоўнага героя, які забіў бязвіннага хлопчыка, на шлях да ўскоснага самапакарання. На шлях самапакарання ступіў і Галаван у аповесці "Крывінка". Але пісьменнік раптоўна перапыняе гэты шлях.

Цынізм Галавана, ужо душэўна акрыялага пасля вяртання да яго блудніцы-дачкі, у фінальнай частцы "Замест эпілога" абсалютны. Яго ранейшае імкненне да духоўнага ўзвышэння праз веру, праз засваенне важных духоўных прынцыпаў ім жа самім і перакрэсліваецца.

Тым не меней, у творы прысутнічае надзея, што гэтае "*старое вучэнне*", адаптаванае грамадскай свядомасцю да іншых ідэалаў – сацыялістычных – усё ж можа быць захаваным (пра гэта сведчыць вобраз Віталія, сына галоўнага героя аповесці, які, як і Насця ў "Выкармку", з'яўляецца прыхільнікам "*ідэй сацыялізму*". Ён "*палітычны антыпод бацькі*".

У якасці адной з каштоўных і выратавальных форм грамадскай свядомасці пісьменнікам вылучаюцца "*ідэі сацыялізму*". Яны паслядоўна адстойваюцца ў аповесцях І. Шамякіна другой паловы 90-х гадоў не толькі ў высновах старэйшага пакалення (напрыклад, у разважаннях "*вернага камуніста*" – пісьменніка "*Івана гомельскага*", аповесць "Выкармак"), а і праз жыццёвую пазіцыю літаратурных герояў сярэдняга пакалення (напрыклад, Насці – "*шалёнай бальшавічкі*", "*камсамолам выхаванай*" – "Выкармак"). Такія факты, відаць, нездарма ўведзены ў мастацкую прастору гэтых аповесцей. Яны ўскосна сведчаць пра наступную пазіцыю пісьменніка. "*Ідэі сацыялізму*" яшчэ могуць мець сваё будучае, бо яны паслядоўна адстойваюцца трывалай у маральных адносінах часткай прадстаўнікоў грамадства, якія не здрадзяць гэтым ідэям, нягледзячы ні на якія матэрыяльныя выгады. Насця ("Выкармак") і Віталій ("Крывінка") застаюцца адзінокімі ў сваіх грамадскіх перакананнях. Але яны, нягледзячы на некаторую штучнасць іх характараў, выклікаюць пэўную чытацкую сімпатыю: яны не як усе, яны, адданыя сваёй ідэі, не саромеюцца агучваць яе, нягледзячы на негатыўныя адносіны большасці з грамадства да такой іх пазіцыі.

Тым не меней, даводзіцца канстатаваць, што такая пазіцыя некаторых герояў І. Шамякіна не знаходзіць прызнання, яны – такія героі – адзінокія



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў іх імкненнях пераканаць большасць. І тут да месца прыгадаць выснову, якую пісьменнік І тут да месца прыгадаць выснову, якую пісьменнік праз няўласна-простую мову аднёс Віталія Галавана – "дацэнта ўніверсітэта, філосафа".

"*Чалавецтва ў сваім развіцці пайшло не па той дарозе*" [2, с. 431].

Такі вывад – гэта і выразная аўтарская пазіцыя І. Шамякіна, якая татальна ўплывае на ўсю сістэму сэнсаўтварэння ў яго аповесцях другой паловы 1990-х гадоў. Адсюль у творах гэтага перыяду сацыяльны разлад, беспрасвецце, несправядлівасць. А малая доля надзеі і спадзяванняў прысутнічае ў іх на ўзроўні прадчування лепшага магчымага, якое перакрэсліваецца ўсё той жа безвыходнасцю.

**Спіс літаратуры**

1. Шамякін, І.П. Збор твораў. У 23 т. Т. 5. Аповесці, 1988–1993 / Іван Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 2011. – 622 с.
2. Шамякін, І.П. Збор твораў. У 23 т. Т. 6. Аповесці, 1994–1996 / Іван Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 2011. – 582 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова